МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«МОГИЛЕВСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ
имени А. А. КУЛЕШОВА»

# РОМАНОВСКИЕ ЧТЕНИЯ – 17

СБОРНИК СТАТЕЙ
МЕЖДУНАРОДНОЙ НАУЧНОЙ КОНФЕРЕНЦИИ

**28 ноября 2024 г.**
**г. Могилев**

Могилев
МГУ имени А. А. Кулешова
2025

УДК 001(063)
ББК 72я431
Р69

*Печатается по решению редакционно-издательского совета*
*МГУ имени А. А. Кулешова*

Рецензенты:
доктор исторических наук, профессор, заведующий кафедрой всеобщей истории учреждения образования «Гомельский государственный университет имени Ф. Скорины» *Н. Н. Мезга*;
доктор филологических наук, профессор, профессор кафедры истории Беларуси, археологии и специальных исторических дисциплин учреждения образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» *С. А. Пивоварчик*;
доктор экономических наук, профессор, проректор по научной работе учреждения образования «Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова» *Н. В. Маковская*;
доктор филологических наук, доцент, профессор кафедры русской филологии и журналистики ФГБОУ ВО «Елецкий государственный университет имени И. А. Бунина» *О.В. Шаталова*

Редакционная коллегия:
кандидат исторических наук, доцент *А. С. Мельникова* (председатель);
кандидат исторических наук *Е. И. Головач*;
кандидат философских наук, доцент *В. В. Старостенко*;
кандидат филологических наук доцент *Е. И. Сердюкова*;
кандидат исторических наук, доцент *В. В. Табунов*;
кандидат исторических наук, доцент *А. В. Колосов*;
кандидат исторических наук *М. В. Заблоцкая*

Р69 **Романовские чтения – 17** : сборник статей Международной научной конференции, Могилев, 28 ноября 2024 г. / под общ. ред.: А. С. Мельниковой, Е. И. Головач. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2025. – 172 с. : ил.

ISBN 978-985-894-187-1

В сборник включены работы отечественных и зарубежных ученых, принявших участие в Международной научной конференции «Романовские чтения – XVII», которая состоялась 28 ноября 2024 г.

Доклады отражают личную точку зрения каждого автора и публикуются в авторской редакции.

**УДК 001(063)**
**ББК 72я431**

**ISBN 978-985-894-187-1**

© Коллектив авторов, 2025
© Оформление.
МГУ имени А. А. Кулешова, 2025

УДК 94 : 379.81 "18/19" (476)

# Метадычныя рэкамендацыі Е. Р. Раманава для правядзення вучнёўскіх археалагічных экскурсій у пачатку ХХ ст.

Зянько Аксана Леанідаўна
намеснік загадчыка аддзела навукова-даследчай і публіцыстычнай дзейнасці Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі
(г. Мінск, Беларусь)

Артыкул прысвечаны пытанням станаўлення практыкі правядзення вучнёўскіх археалагічных экскурсій у навучальных установах Віленскай навучальнай акругі ў пачатку ХХ ст. і ролі Е. Р. Раманава ў тэарэтыка-метадычным забеспячэнні гэтага працэсу.

У канцы ХІХ ст. у педагагічнай практыцы пачынае выкарыстоўвацца «экскурсійны метад», які прадугледжвае перадачу ведаў праз назіранне і вывучэнне аб’ектаў на месцы іх натуральнага знаходжання пры дапамозе перамяшчэння ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу, гэта значыць шляхам правядзення экскурсій. Дзякуючы цыркуляру міністра народнай асветы папячыцелям навучальных акруг ад 2 жніўня 1900 г. № 20.185, экскурсіі становяцца абавязковай формай не толькі выхаваўчай, але і адукацыйнай дзейнасці [1, арк. 78–78 адв.]. У пачатку ХХ ст. яны набылі значную папулярнасць сярод настаўнікаў і атрымалі падтрымку кіраўнікоў адукацыі на месцах. «… галоўнай задачай экскурсій было пераадоленне бар’ераў паміж атрыманымі ў школе тэарэтычнымі ведамі і рэальным жыццём, развіццё асобы навучэнца. Ключавым дзеяннем падчас экскурсіі станавілася даследаванне, атрыманне новых ведаў. Гэта быў час бязмежнай веры ў магчымасці навукі» [2, с. 175]. Такая сітуацыя прывяла да з’яўлення рознага віду адукацыйных экскурсій: прамысловыя, біялагічныя, астранамічныя, прыродазнаўчыя, археалагічныя.

Так, у 1910 г. археалагічныя экскурсіі ажыццявілі навучэнцы Гродзенскай і Ковенскай гімназій. Першыя, пад кіраўніцтвам настаўніка гісторыі, для правядзення ўрока па тэме «Каменны век» адправіліся ў ваколіцы Гародні, дзе ў Пералескаўскім рове шукалі артэфакты каменнага веку. Як адзначалася ў справаздачы, вучням удалося знайсці толькі некалькі акамянеласцей [3, с. 123]. Удзельнікі археалагічнай экскурсіі Ковенскай гімназіі накіраваліся ва ўрочышча Лінкова (за дзве вярсты ад Коўна). Для правядзення экскурсіі быў запрошаны мясцовы мастак, краязнаўца і археолаг Т. Даўгірд, які даў навучэнцам неабходныя настаўленні. Пасля гэтага «… вучні прыняліся за ўважлівы агляд азначанага раёна і ў непрацяглы час сабралі шмат чарапкоў ляпнога посуду, некалькі абломкаў

крамянёвых стрэл і адзін крамянёвы ножык; усе знойдзеныя прадметы былі потым сабраны і рассартаваны». Прадоўжылася экскурсія на размешчаным побач гарадзішчы, дзе на месцы старажытных пахаванняў удалося знайсці «… кусок старадаўняга шыйнага ўпрыгожання з кручанай бронзы і такі ж кусочак ланцужка» [3, с. 105].

Працуючы інспектарам народных вучылішч, Е. Р. Раманаў ведаў аб жаданні настаўнікаў, у першую чаргу гісторыі і прыродазнаўства, выкарыстоўваць экскурсіі як новы, прагрэсіўны метад выкладання. У сваю чаргу, як вядомы вучоны-археолаг, ён разумеў, што правядзенне археалагічных экскурсій з навучэнцамі без папярэдняй падрыхтоўкі і падрабязных метадычных указанняў можа прынесці больш шкоды, чым карысці, так як не кожная навучальная ўстанова мела магчымасць запрасіць для правядзення такога мерапрыемства прафесійнага археолага. У 1909 г. ён распрацаваў «Кароткія ўказанні да здзяйснення археалагічных экскурсій сярэднімі навучальнымі ўстановамі Віленскай навучальнай акругі». Указанні былі надрукаваны ў перыядычным выданні Міністэрства народнай асветы «Цыркуляры па кіраванні Віленскай навучальнай акругай» [4, с. 155]. Сведчаннем прызнання важнасці працы Е. Р. Раманава з’яўлялася не толькі публікацыя ўказанняў у афіцыйным педагагічным часопісе, але і дасылка іх кіраўніцтвам Віленскай навучальнай акругі ва ўстановы адукацыі для азнаямлення і выкарыстання. Напрыклад, такі дакумент змяшчаецца ў справе «Аб правядзенні экскурсій семінарыстаў» у фондзе Полацкай настаўніцкай семінарыі Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (далей – НГАБ) [5, арк. 31–36 адв.]. Дадзены факт з’яўляецца і пацвярджэннем таго, што археалагічныя экскурсіі мелі месца ў навучальным працэсе і кіраўніцтва адукацыяй было зацікаўлена ў іх якасным правядзенні.

Нягледзячы на назву «Кароткія ўказанні да здзяйснення археалагічных экскурсій сярэднімі навучальнымі ўстановамі Віленскай навучальнай акругі», у дакуменце даволі падрабязна апісаны ўсе этапы археалагічнай экскурсіі – ад падрыхтоўкі да падвядзення вынікаў. Е. Р. Раманаў надае ўвагу як тэхнічнаму баку арганізацыі экскурсіі, так і тэарэтыка-метадычнаму. Аўтар абазначыў найбольш спрыяльны перыяд для правядзення археалагічных экскурсій – з красавіка па кастрычнік, і рэкамендаваў не праводзіць іх падчас сялянскіх сельскагаспадарчых работ у сувязі са значным павышэннем кошту рабочай сілы. Колькасць удзельнікаў павінна быць абмежавана 15–16 вучнямі старэйшых класаў. Акрамя кіраўніка, да ўдзелу ў экскурсіі пажадана запрасіць настаўніка гісторыі, мастацтва (для стварэння замалёвак), або фатографа. Важнай часткай падрыхтоўкі такіх мерапрыемстваў вучоны лічыў вывучэнне «… матэрыялаў, якія маюцца па мясцовай археалогіі і на аснове такога вывучэння выбіраць пункты для паездкі, якая мае адбыцца» [5, арк. 31]. Даследчык звяртае ўвагу кіраўнікоў на тое, каб для археалагічных экскурсій навучэнцаў выбіраліся нескладаныя археалагічныя аб’екты: курганы, магільнікі і пасяленні першабытных

людзей. Е. Р. Раманаў прапануе для гэтага як спіс ужо надрукаваных археалагічных карт, так і свае ўласныя па Магілёўскай і Віцебскай губерні, якія складаў некалькі гадоў, але так і не надрукаваныя. Таксама ён рэкамендуе «… азнаёміцца з вынікамі працы ў дадзенай мясцовасці папярэдніх даследчыкаў» [5, арк. 31]. Ва ўказаннях вучоны падрабязна апісвае неабходныя для правядзення раскопак прылады і інструменты, іх колькасць (компас, рулетка, стальныя шчупы, стальныя нажы, сіта, каробкі для знаходак і інш.), а таксама механізм атрымання дазволу на археалагічнае даследаванне. Аўтар асаблівую ўвагу звяртае на абавязковае вядзенне падрабязнага пратакола раскопак: «Гэта ўмова настолькі істотная, што раскопка помніка без пратакола лічыцца варварскім яго знішчэннем» [5, арк. ўнесці ў пратакол. Вучоны прапаноўвае выкарыстаць яго ўласны метад паслойнага раскопвання курганоў, які на той час з'яўляўся наватарскай ідэяй

Як бачна з дакумента, мэта такіх экскурсій, на думку вучонага, заключалася не толькі ў назіранні і азнаямленні з правядзеннем археалагічных раскопак, а непасрэдны удзел у іх: « …дакладна неабходна прывіць юнакам погляд на такія экскурсіі не як на прагулкі, маёўкі і г. д., але як на магутны сродак папоўніць свае кніжныя веды асабістым вывучэннем найстаражытнейшых першакрыніц і на свае вочы ўбачыць тыя пахавальныя абрады і звычаі VI–XII ст., якія так праўдзіва апісаны Ібн-Фацланам, Ібн-Дастай, Нестарам і інш.» [5, арк. 33].

У канцы XIX – пачатку XX ст. у грамадстве не было дакладнага вызначанага тлумачэння тэрміну «экскурсія». Экскурсіямі маглі называць і «грандыёзнае падарожжа на Парыжскую сусветную выставу… і загарадныя вылазкі, часткова падобныя на пікнік… Экскурсіямі лічыліся і плаванні па Фінскаму заліву, і пад'ём у горы, арганізаваны горным клубам» [3, с. 176]. Часта навукоўцы азначанага перыяду называлі экскурсіямі навуковыя экспедыцыі. Аналіз дакумента паказвае, што Е. Р. Раманаў атаясамліваў археалагічныя экскурсіі з археалагічнымі раскопкамі. Вучоны спадзяваўся, што такія археалагічныя экскурсіі для навучэнцаў стануць сталай з'явай вучэбнага працэсу і прынясуць карысць для развіцця навукі. «Разам з тым, праведзеныя сістэматычна на працягу некалькіх год, археалагічныя разведкі і раскопкі несумненна будуць спрыяць абагачэнню археалогіі новымі дадзенымі. Апісанні раскопак з чарцяжамі, планамі і здымкамі, могуць друкавацца ў гадавых справаздачах навучальных устаноў або ў «Працах» Паўночна-Заходняга Аддзела Імп. Рус. Геаграф. Таварыства, і такім чынам, нашы юнакі, акрамя асабістай карысці для сябе, унясуць і пасільны ўклад свой у агульную скарбніцу рускай гістарычнай навукі» [5, арк. 33].

Вывучэнне гісторыі і культуры роднага краю, іх папулярызацыя шляхам правядзення экскурсій і турыстычных падарожжаў звязана з фарміраваннем нацыянальнай свядомасці і пошукам нацыянальнай

ідэнтычнасці. Не застаўся ў баку ад гэтай справы і Е. Р. Раманаў – выдатны навуковец, этнограф, лінгвіст, археолаг. Неабходна адзначыць, што Таварыства вывучэння Беларускага краю ў Магілёве, створанае па ініцыятыве вучонага, для рэалізацыі такіх задач як усебаковае вывучэнне беларускіх губерняў, распаўсюджанне сярод насельніцтва гістарычных, эканамічных, прыродазнаўчых навуковых ведаў, папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны, планавала ў тым ліку і правядзенне прыродазнаўчых і гістарычных экскурсій [6].

З'яўляючыся прафесійным педагогам, Е. Р. Раманаў бачыў, што справа правядзення вучнёўскіх археалагічных экскурсій была сканцэнтравана ў руках выкладчыкаў-энтузіястаў, якія, у большасці, не мелі неабходнага вопыту і падрыхтоўкі. Зразумела, гэта непакоіла яго як вучонага-археолага і падштурхнула, на нашу думку, да напісання «Кароткіх указанняў да здзяйснення археалагічных экскурсій сярэднімі навучальнымі ўстановамі Віленскай навучальнай акругі». Е. Р. Раманаў далучыў да метадычных парад па правядзенні вучнёўскіх археалагічных экскурсій свой багаты даследчыцкі вопыт, што зрабіла гэтыя распрацоўкі актуальнымі і ў наш час.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

НГАБ. – Ф. 2261. Воп. 1. Спр. 175.

Сизинцева, Л. И. Экскурсии начала XX века. К вопросу о формировании практик повседневности / Л. И. Сизинцева // Практики повседневности : материалы Всероссийского науч.-метод. семинара, Екатеринбург, 26 февраля 2011 г. / Уральский федеральный ун-т. – Екатеринбург, 2011. – С. 174–179.

Описание экскурсий учащихся Виленского учебного округа за 1910 г. : по поручению упр. Вилен. учеб. округа / сост. А. И. Шестов. – Вильня : Изд. упр. Вилен. учеб. округа, 1911. – IX, 238 с.

Алексеев, Л. В. Археология и краеведение Беларуси XVI – 30-е годы XX в. / Л. В. Алексеев. – Минск : Беларуская навука, 1996. – 206 с.

НГАБ. – Ф. 2566. Воп. 1. Спр. 624.

Устав Общества изучения Белорусского края в гор. Могилеве. – Витебск : Губерн. тип., 1905. – 11 с.